ISSN 1993-1972




# ГІСТОРЫЯ
## праблемы выкладання

"У дапамогу педагогу"
Серыя

НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ЧАСОПІС 4/2008



Серыя «У дапамогу педагогу»
заснавана ў 1995 годзе

Навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з I квартала 1997 года
Рэгістрацыйны № 842
Выходзіць штомесяц са студзеня 2006 г.

# ГІСТОРЫЯ
## ПРАБЛЕМЫ ВЫКЛАДАННЯ

"У дапамогу педагогу" Серыя

№ 4 (70) ' 2008

**РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ**

**М. І. МІНЦКІ — галоўны рэдактар,** *доктар гістарычных навук*

**У. В. ТУГАЙ — першы намеснік галоўнага рэдактара,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**Н. М. ГАНУШЧАНКА — намеснік галоўнага рэдактара,** *кандыдат гістарычных навук*
**Л. В. САЛАМАХА — адказны сакратар**
**І. І. БАГДАНОВІЧ,** *кандыдат педагагічных навук*
**С. В. ПАНОЎ,** *кандыдат педагагічных навук*
**С. М. ХОДЗІН,** *кандыдат гістарычных навук*
**В. М. ШУТАВА,** *кандыдат гістарычных навук*
**Л. У. ЖЭРКА**

**РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА**

**У. В. ТУГАЙ — старшыня**
**М. М. ЗАБАЎСКІ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**А. А. КАВАЛЕНЯ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**В. А. КАПРАНАВА,** *доктар педагагічных навук*
**І. В. КАРПЕНКА**
**Г. А. КОСМАЧ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**У. С. КОШАЛЕЎ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**М. С. СТАШКЕВІЧ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**В. М. ФАМІН,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**І. І. ЦЫРКУН,** *доктар педагагічных навук, прафесар*



**Заснавальнік і выдавец —**
**РУП «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"»**
**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**

220070, г. Мінск, вул. Будзённага, 21; тэл.: 297-93-20 (адк. сакратар),
297-93-22 (аддзел маркетынгу), факс: 297-91-49
e-mail: aiv@aiv.by, http://www.aiv.by

# ГІСТОРЫЯ
## ПРАБЛЕМЫ ВЫКЛАДАННЯ

### ТЭОРЫЯ ГІСТАРЫЧНАЙ НАВУКІ

3 **Корзенко Георгий**
Наука Беларуси: формирование и развитие
7 **Багдановіч Іван, Багдановіч Андрэй**
Парагісторыя: шляхі супрацьдзеяння ёй у гістарычнай адукацыі
11 **Шаўчук Ігар**
Навукова-арганізацыйная структура ВНУ БССР (20–30-я гады XX стагоддзя)

### ДЫДАКТЫКА І ТЭХНАЛОГІІ

16 **Макеенкова Елена**
Буржуазные реформы 60–70-х годов XIX века в России
19 **Макеенкава Алена**
Беларусь у XVI — першай палове XVIII стагоддзя
23 **Дегтярёва Ольга**
Начало Великой Отечественной войны. Урок по всемирной истории в IX классе
27 **Сурконт Татьяна**
Системное использование кабинета — одно из условий повышения качества образования и воспитания
31 **Лебедзь Міхаіл**
Асновы этнаграфіі Беларусі
**35** **Фастович Светлана**
Этапы организации учебно-познавательной деятельности учащихся V класса

### МЕТАДЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

46 **Луговцова Светлана, Темушев Степан**
Основы государства и права восточных славян
52 **Ярашэвіч Леанід**
Метадычныя рэкамендацыі па выкарыстанні практыка-арыентаванага падыходу пры падрыхтоўцы вучняў базавай школы да выніковай атэстацыі па гісторыі Беларусі

### ДАПАМОЖНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

58 **Волкова Ольга**
Женский вопрос на страницах социал-демократических периодических изданий в годы Первой русской революции
62 **Кузюкович Анна**
Государственная политика Беларуси по развитию физической культуры и спорта (1920–1930-е годы)

*Для афармлення першай і чацвёртай старонак вокладкі часопіса выкарыстаны ілюстрацыі з кнігі «Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне» (Мінск : Беларусь, 2004. — 230 с.)*

© РУП «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"», 2008
© Вокладка. Р. А. Раманцоў, 2008

# Метадычныя рэкамендацыі
## па выкарыстанні практыка-арыентаванага падыходу пры падрыхтоўцы вучняў базавай школы да выніковай атэстацыі па гісторыі Беларусі

*Леанід Ярашэвіч, настаўнік гісторыі сярэдняй школы № 15 г. Пінска, суіскальнік кафедры культурна-гістарычнай спадчыны Беларусі РІВШ*

***Дзейнасны падыход да навучання гісторыі Беларусі, які прызнаецца адным з аптымальных сродкаў актывізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці школьнікаў, абумоўлівае мэтазгоднасць выкарыстання камбінаванай формы правядзення выніковай атэстацыі. У артыкуле змешчаны метадычныя рэкамендацыі па распрацоўцы і ўжыванні тэстаў і практыка-арыентаваных заданняў разам з традыцыйнай вуснай формай правядзення абавязковага экзамену па гісторыі Беларусі. Дадзены матэрыял актуалізаваны ўвядзеннем дапрофільнай падрыхтоўкі вучняў IX–X класаў, якія вывучаюць гісторыю Беларусі на паглыбленым узроўні.***

**Уводзіны.** Аналіз вуснай формы правядзення выніковай атэстацыі і ацэнкі ведаў і ўменняў вучняў па гісторыі Беларусі за курс базавай школы сведчыць, што ва ўмовах дапрофільнай падрыхтоўкі гэта форма патрабуе аптымізацыі для школьнікаў, якія вывучалі прадмет на паглыбленым узроўні. Важным момантам у працэсе навучання і падрыхтоўкі да экзамену з'яўляецца паступальны характар авалодання факталагічнымі і тэарэтычнымі ведамі — ад лакалізацыі гістарычных падзей у часе і прасторы да ведання розных версій падзей і выказвання ўласных адносін да іх [1, с. 16]. Паўнавартасны кантроль і ацэнку вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці школьнікаў магчыма ажыццяўляць з дапамогай тэставых заданняў, распрацаваных на аснове патрабаванняў адукацыйнага стандарта і зместу дапаможнікаў для VI–X класаў па гісторыі Беларусі. Тэст дазваляе якасна і эфектыўна вызначаць узровень падрыхтоўкі выпускнікоў [2, с. 19].

**Асноўная частка.** Тэставая форма падрыхтоўкі да экзамену структуравана па ўзроўнях складанасці вучэбнага матэрыялу, якія карэлююцца з узроўнямі засваення зместу ў адпаведнасці з палажэннямі дзесяцібальнай сістэмы ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці школьнікаў [4, с. 30]. Пры выкананні тэставых заданняў ад іх патрабуецца валоданне пераважна факталагічнымі ведамі, у прыватнасці хранагічнымі і картаграфічнымі, што рэалізуецца ў асноўным праз заданні закрытай формы. Такая форма тэстаў адпавядае першым двум узроўням засваення зместу вучэбнага матэрыялу. Авалоданне вучнямі тэарэтычнымі кампанентамі гістарычных ведаў, уменнямі вызначаць прычынна-выніковыя сувязі, сістэматызаваць і абагульняць матэрыял адпавядае трэцяму і чацвёртаму ўзроўням засваення вучэбнага матэрыялу, што рэалізуецца праз тэставыя заданні адкрытай формы [3, с. 89–90].

У якасці прыкладу распрацоўкі комплексу тэставых заданняў выкарыстана экзаменацыйнае пытанне «Культура Беларусі ў X–XIII стст.» у білеце № 4. Уяўляецца мэтазгодным вызначыць узровень патрабаванняў да падрыхтоўкі вучняў па гэтым пытанні.

### *Першы і другі ўзроўні*

**Даваць вызначэнне наступных паняццяў:** асветнік, мураванае дойлідства, плінфа, фрэска, язычніцтва **(павышаны ўзровень).**

**Называць гады і стагоддзі:** прыняцця хрысціянства (988); будаўніцтва Сафійскага сабора ў Полацку (XI ст.); жыцця Еўфрасінні Полацкай (XII ст.).

**Пералічваць:** імёны рэлігійна-асветніцкіх дзеячаў (Еўфрасіння Полацкая, Кірыл Тураўскі); імёны майстроў (Лазар Богша); помнікі пісьменнасці (камяні з надпісамі, берасцяныя граматы, летапісы, рукапісныя кнігі); архітэктурныя помнікі (Полацкі

Сафійскі сабор, Спаса-Еўфрасіннеўская царква, Каложская царква, Камянецкая вежа), помнікі мастацтва (крыж Лазара Богшы).

**Паказваць на карце:** гарады, дзе былі пабудаваны Сафійскія саборы (Ноўгарад, Кіеў, Полацк).

### *Трэці ўзровень*

**Тлумачыць:** прычыны пабудовы Сафійскага сабора і Камянецкай вежы; паняцце «стоўпнік»; вынікі рэлігійна-асветніцкай дзейнасці **(павышаны ўзровень).**

**Параўноўваць:** язычніцтва і хрысціянства; полацкую і гродзенскую архітэктурныя школы **(паглыблены ўзровень).**

### *Чацвёрты ўзровень*

**Даваць характарыстыку:** асветніцкай дзейнасці Еўфрасінні Полацкай, Кірыла Тураўскага.

**Самастойна параўноўваць:** Сафійскі сабор у Полацку і Кіеве **(паглыблены ўзровень).**

### *Пяты ўзровень*

**Выказваць свае адносіны да:** дзейнасці Еўфрасінні Полацкай, Кірыла Тураўскага.

**Вызначаць, што:** крыж Еўфрасінні Полацкай з'яўляецца гісторыка-культурнай і хрысціянскай святыняй беларускага народа **(павышаны ўзровень);** помнікі пісьменнасці і архітэктуры, шэдэўры мастацтва сведчаць аб развіцці духоўнай культуры беларускіх зямель **(паглыблены ўзровень).**

Комплекс тэставых заданняў можа ўключаць у сабе наступныя пункты (вызначце правільны варыянт адказу):

**1. Пачатак распаўсюджвання хрысціянства на беларускіх землях прыпадае на:**

а) IX ст.; в) XI–XII стст.;
б) X ст.; г) XIII ст.

**2. Адзін з найбольш старажытных помнікаў пісьменства на беларускіх землях:**

а) пячатка князя Ізяслава з надпісам;
б) Рагвалодаў камень;
в) касцяны грэбень з літарамі на ім;
г) надпіс на гліняным гаршчку.

**3. Горад, дзе ўзнікла першая беларуская епархія:**

а) Мінск; в) Полацк;
б) Навagрадак; г) Тураў.

**4. Год, калі ўзнікла епархія ў Тураве (павышаны ўзровень):**

а) 998 г.; в) 1003 г.;
б) 992 г.; г) 1105 г.

**5. Пісьмовыя гістарычныя помнікі на беларускіх землях, на якіх упершыню змешчаны ініцыялы — буквіцы візантыйскага стылю (паглыблены ўзровень):**

а) Аршанскае Евангелле;
б) Лаўрышаўскае Евангелле;
в) Аповесць мінулых гадоў;
г) Тураўскае Евангелле.

**6. Матэрыялы, якія выкарыстоўваліся для пісьма ў раннім Сярэднявеччы:**

а) вашчына; в) папера;
б) бяроста; г) тканіна.

**7. Колькасць Барысавых камянёў, якія захаваліся на Беларусі да сённяшняга часу (паглыблены ўзровень):**

а) не захавалася ніводнага; в) пяць;
б) тры; г) дзевяць.

**8. Горад, у якім знойдзены грэбень з дрэва, на якім паслядоўна размешчаны славянскія літары і які выконваў ролю буквара (павышаны ўзровень):**

а) Брэст; в) Мсціслаў;
б) Віцебск; г) Полацк.

**9. Горад, у якім знойдзена першая берасцяная грамата на тэрыторыі Беларусі (павышаны ўзровень):**

а) Брэст; в) Мсціслаў;
б) Віцебск; г) Полацк.

**10. Спецыяльна апрацаваная тонкая скура маладых жывёл, якая ўжывалася для напісання першых кніг:**

а) вашчына; в) корд;
б) кенатаф; г) пергамент.

**11. Найбольш старажытная гістарычна вядомая рукапісная кніга на Беларусі, якая захавалася да нашых дзён (павышаны ўзровень):**

а) Іпацьеўскі летапіс;
б) Полацкае Евангелле;
в) Полацкі летапіс;
г) Тураўскае Евангелле.

**12. Запіс падзей у славянскай гісторыі ў храналагічным парадку (па гадах):**

а) летапіс; в) сага;
б) хроніка; г) скрыпторый.

**13. Перыяд гісторыі Полацкай зямлі, апісаны ў выдатным літаратурным і гістарычным помніку славянскага пісьменства «Слова пра паход Ігаравы» (павышаны ўзровень):**

а) існаванне родаплемяннога ладу;
б) княжанне Рагвалода;
в) княжанне Усяслава Чарадзея;
г) «полацкае выгнанне».

**14. Выдатны літаратурны гістарычны помнік славянскага пісьменства «Слова**

пра паход Ігаравы» датуецца (паглыблены ўзровень):

а) X ст.; в) XII ст.;
б) XI ст.; г) XIII ст.

15. **Надпіс на крыжы Лазара Богшы, зроблены (павышаны ўзровень):**

а) кірыліцай; в) лацініцай;
б) глаголіцай; г) рунічным пісьмом.

16. **Назва пісьмовай гістарычнай крыніцы, у якой князь Усяслаў параўноўваецца з ваўкалакам:**

а) «Аповесць мінулых гадоў»;
б) «Летапісец вялікіх князёў літоўскіх»;
в) «Слова пра паход Ігаравы»;
г) «Руская праўда».

17. **Выдатны асветнік XII ст. на беларускіх землях:**

а) Аўрамій Смаленскі;
б) Францыск Скарына;
в) Кірыл Тураўскі;
г) Кліменцій Смаляціч.

18. **Апякункай і заступніцай Беларусі па хрысціянскіх канонах з'яўляецца:**

а) Рагнеда Рагвалодаўна;
б) Еўфрасіння Полацкая;
в) Саламея Русецкая;
г) Параскева Полацкая.

19. **Архітэктурны стыль, які лёг у аснову культавага будаўніцтва ўсходніх славян (павышаны ўзровень):**

а) гатычны;
б) класіцызм;
в) крыжова-купальны (візантыйскі);
г) раманскі.

20. **Напрамак у мураваным дойлідстве на беларускіх землях у часы ранняга Сярэднявечча (паглыблены ўзровень):**

а) фрэскавы;
б) культавы (рэлігійны);
в) свецкі;
г) палацава-паркавы.

21. **Плінфа ў беларускім мураваным дойлідстве ранняга Сярэднявечча — гэта (павышаны ўзровень):**

а) керамічны сасуд, замураваны ў храмавую сцяну;
б) назва царкоўнага музычнага інструмента;
в) саліст — пеўчы ў храме;
г) шырокая і плоская абпаленая цэгла.

22. **Сафійскі сабор у Полацку быў пабудаваны ў часы кіравання князя:**

а) Ізяслава; в) Таўцівіла;
б) Рагвалода; г) Усяслава Чарадзея.

23. **Колькасць купалоў, якую меў Сафійскі сабор у Полацку (павышаны ўзровень):**

а) дзевяць; в) пяць;
б) сем; г) тры.

24. **Фрэска — гэта:**

а) верхняя галерэя царквы;
б) малюнак вадзянымі фарбамі на сырой тынкоўцы;
в) паўкруглае завяршэнне часткі знешняй тынкоўкі;
г) узор са смальты ці каляровых каменьчыкаў.

25. **Адзіны храм XII ст. на Беларусі, у якім да сённяшняга часу амаль цалкам захаваўся фрэскавы роспіс (павышаны ўзровень):**

а) Барысаглебская царква ў Гродна;
б) Камянецкая вежа;
в) Полацкая Сафія;
г) Спаса-Еўфрасіннеўская царква ў Полацку.

26. **Помнік беларускага дойлідства XIII ст., вядомы пад назвай «данжон» (паглыблены ўзровень):**

а) Камянецкая вежа;
б) Маламажэйкаўская царква-крэпасць;
в) Нясвіжскі палацава-паркавы ансамбль;
г) Спаса-Еўфрасіннеўская царква ў Полацку.

27. **Помнік беларускага дойлідства XII ст., які пабудаваны ў гонар забітых князёў Барыса і Глеба (паглыблены ўзровень):**

а) Каложская царква ў Гродна;
б) Камянецкая вежа на Брэстчыне;
в) Сафійскі сабор у Полацку;
г) Спаская царква ў Полацку.

28. **Архітэктурны стыль у мураваным дойлідстве на беларускіх землях у часы ранняга Сярэднявечча, да якога належыць Камянецкая (Белая) вежа (павышаны ўзровень):**

а) готыка;
б) класіцызм;
в) крыжова-купальны (візантыйскі);
г) раманскі.

29. **Год, у якім быў створаны крыж полацкага майстра Лазара Богшы (павышаны ўзровень):**

а) 982 г.; в) 1161 г.;
б) 1061 г.; г) 1261 г.

30. **Беларускі майстар XX ст., які аднавіў шэдэўр Лазара Богшы — крыж Еўфрасінні Полацкай (павышаны ўзровень):**

а) А. Мальдзіс; в) М. Савіцкі;
б) М. Кузьміч; г) П. Міланега.

**Вызначыце правільную паслядоўнасць:**

31. а) пачатак хрысціянізацыі ўсходнеславянскіх зямель;
б) утварэнне епархіі ў Полацку;

в) утварэнне епархіі ў Тураве;

г) хрышчэнне ў Кіеве **(паглыблены ўзровень).**

32. а) пачатак хрысціянізацыі ўсходнеславянскіх зямель;

б) пабудова Сафійскага сабора ў Полацку;

в) стварэнне крыжа Еўфрасінні Полацкай;

г) узнікненне першай на Беларусі епархіі **(павышаны ўзровень).**

33. а) будаўніцтва Сафійскага сабора ў Полацку;

б) будаўніцтва Спаса-Еўфрасіннеўскай царквы ў Полацку;

в) першы прыклад мастацтва на ўсходнеславянскіх землях;

г) першы прыклад стоўпніцтва на ўсходнеславянскіх землях **(павышаны ўзровень).**

34. а) жыццё і дзейнасць Еўфрасінні Полацкай;

б) жыццё і дзейнасць Кірыла Тураўскага;

в) жыццё і дзейнасць Рагнеды Рагвалодаўны і Ізяслава;

г) жыццё і дзейнасць Усяслава Чарадзея.

35. а) «Аповесць мінулых гадоў»;

б) надпіс на крыжы Лазара Богшы;

в) «Слова пра паход Ігаравы»;

г) Тураўскае Евангелле **(павышаны ўзровень).**

**Суаднясіце элементы двух мностваў:**

**36.**

| | |
|---|---|
| 1) «Аповесць мінулых гадоў»; | а) заклік да яднання і аднаўлення магутнасці ўсходнеславянскіх зямель; |
| 2) «Сказанне пра чын чарнарызца»; | б) пачатак летапісання на ўсходнеславянскіх землях; |
| 3) «Слова пра паход Ігаравы»; | в) прыклад агіяграфічнай літаратуры; |
| 4) Тураўскае Евангелле. | г) прыклад найбольш ранняй з вядомых на Беларусі рукапісных кніг **(паглыблены ўзровень).** |

**37.**

| | |
|---|---|
| 1) апсіда; | а) жывапісны твор малых памераў; |
| 2) мазаіка; | б) малюнак вадзянымі фарбамі на сырой тынкоўцы; |
| 3) мініяцюра; | в) паўкруглае завяршэнне часткі знешняй сцяны будынка; |
| 4) фрэска. | г) узор са смальты ці каляровых каменьчыкаў **(павышаны ўзровень).** |

**38.**

| | |
|---|---|
| 1) Алекса; | а) Барысаглебская царква ў Гродна; |
| 2) Давыд, Тума, Мікула; | б) Белая вежа ў Камянцы; |
| 3) Іаан; | в) Сафійскі сабор ў Полацку; |
| 4) Пётр Міланега. | г) Спаса-Еўфрасіннеўская царква ў Полацку **(паглыблены ўзровень).** |

**39.**

| | |
|---|---|
| 1) абраз; | а) замураваны ў сцяну храма керамічны сасуд, які дазваляў палепшыць акустыку пабудовы; |
| 2) галаснік; | б) майстэрня па перапісцы кніг; |
| 3) плінфа; | в) прыклад станковага жывапісу, прадмет рэлігійнага культу; |
| 4) скрыпторый. | г) шырокая і плоская абпаленая цэгла **(павышаны ўзровень).** |

**40.**

| | |
|---|---|
| 1) Еўфрасіння Полацкая; | а) «Аповесць мінулых гадоў»; |
| 2) Ізяслаў Уладзіміравіч; | б) крыж Лазара Богшы; |
| 3) Нестар; | в) пярсцёнак-сігнет; |
| 4) Усяслаў Чарадзей. | г) Сафійскі сабор у Полацку. |

**Упішыце паняцці, тэрміны, назвы ці імёны:**

**41.** Агульнанавуковае філасофскае паняцце, якое ў сукупнасці азначае спосабы і вынікі дзейнасці чалавека і грамадства; у перакладзе з латыні — апрацоўка глебы **(павышаны ўзровень):** ________________.

**42.** Імя епіскапа першай заснаванай у Тураве епархіі **(паглыблены ўзровень):** _____.

**43.** Імя старажытнага майстра — аўтара шэдэўра ювелірнага мастацтва, зробленага па заказе Еўфрасінні Полацкай: _____.

**44.** Назва прылады, пры дапамозе якой выдрапваліся літары на берасцяных граматах: _____________.

**45.** Горад, дзе было створана найранняе Евангелле з тых, што захаваліся на беларускіх землях да сённяшніх часоў **(павышаны ўзровень):** ____________.

**Адказы**

| | |
|---|---|
| **1.** Б | **23.** Б |
| **2.** А | **24.** Б |
| **3.** В | **25.** Г |

| | |
|---|---|
| 4. Г | 26. А |
| 5. Г | 27. А |
| 6. Б | 28. Г |
| 7. Б | 29. В |
| 8. А | 30. Б |
| 9. Б | 31. ГБВА |
| 10. Г | 32. АГБВ |
| 11. Г | 33. ВАГБ |
| 12. А | 34. ВГБА |
| 13. В | 35. ГАБВ |
| 14. В | 36. 1Б2В3А4Г |
| 15. А | 37. 1В2Г3А4Б |
| 16. В | 38. 1Б2В3Г4А |
| 17. В | 39. 1В2А3Г4Б |
| 18. Б | 40. 1Б2В3А4Г |
| 19. В | 41. культура |
| 20. Б | 42. Фама |
| 21. Г | 43. Лазар Богша |
| 22. Г | 44. пісáла |
| | 45. Тураў |

На трэцяе пытанне білета № 4 для школьнікаў, якія вывучалі гісторыю Беларусі на паглыбленым узроўні, прадугледжваецца выкананне практыка-арыентаванага задання. Вучні павінны прымяніць набытыя гістарычныя веды на практыцы ў знаёмай ці часткова невядомай сітуацыі, а таксама вырашыць пэўныя тыповыя задачы і даць адказы на праблемныя пытанні [5, с. 11–12]. Абапіраючыся на гістарычныя факты, ім неабходна даказаць, што ў гады Вялікай Айчыннай вайны барацьба супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у БССР мела ўсенародны і інтэрнацыянальны характар. У якасці аргументаў мэтазгодна выкарыстаць наступны матэрыял.

Пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі ствараліся і разгортвалі свае дзеянні партызанскія атрады, арганізоўвалася і ўзмацнялася падпольная барацьба. Была створана сетка падпольных партыйных і камсамольскіх арганізацый. Ініцыятыву ў арганізацыі супраціўлення ворагу часта бралі на сябе простыя людзі — радавыя камуністы і беспартыйныя патрыёты.

Ужо на пяты дзень вайны ў Пінскім раёне быў сфарміраваны адзін з першых партызанскіх атрадаў у Беларусі, які ўступіў у бой з захопнікамі. Потым ён пераўтварыўся ў партызанскую брыгаду. Атрад узначальваў Васіль Корж, які ў 1943 г. атрымаў воінскае званне генерал-маёра, а ў наступным годзе стаў Героям Савецкага Саюза.

У першыя дні вайны ў Кастрычніцкім раёне Палескай вобласці быў створаны партызанскі атрад «Чырвоны Кастрычнік», які ўзначаліў Ціхан Бумажкоў, а потым Фёдар Паўлоўскі. Шостага жніўня 1941 г. ім першым з савецкіх партызан прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У ліпені 1941 г. рабочымі кардоннай фабрыкі ў пасёлку Пудаць Суражскага раёна быў створаны партызанскі атрад пад кіраўніцтвам дырэктара Міная Шмырова. Ён стаў стваральнікам 1-й Беларускай партызанскай брыгады, Героем Савецкага Саюза. За яго галаву фашысты давалі 30 тыс. марак і карову, але здраднікаў не знайшлося. Тады акупанты схапілі чацвёра дзяцей Міная ў якасці заложнікаў і расстралялі. Партызаны адпомсцілі за іх.

Камісарам адной з партызанскіх брыгад стаў Пётр Міронавіч Машэраў, які напярэдадні вайны працаваў настаўнікам фізікі і матэматыкі. Стварыў Расонскае партыйна-камсамольскае падполле. Сакратар Вілейскага падпольнага абкома камсамола. У 26 гадоў стаў Героем Савецкага Саюза.

У ходзе барацьбы з ворагам у канцы 1943 г. партызанам удалося вызваліць і кантраляваць каля 60 % акупіраванай тэрыторыі Беларусі. Тут з'явіліся партызанскія зоны. Разгортвалася так званая рэйкавая вайна — акцыя партызан па масавым разбурэнні чыгунак з мэтай дэзарганізацыі нямецкіх ваенных перавозак.

Дыверсійную дзейнасць на буйным чыгуначным вузле «Орша» разгарнуў былы начальнік паравознага дэпо гэтага вузла Канстанцін Заслонаў, які здолеў уладкавацца да немцаў начальнікам рускіх паравозных брыгад і меў права самастойна набіраць рабочую сілу. Яго людзі рабілі міны, знешне падобныя на кавалкі вугалю. Іх праз вугальныя склады падкідвалі ў паравозныя топкі. Заслонаўцы вывелі са строю больш за 200 паравозаў і пусцілі пад адхон 100 паяздоў.

Актыўна дзейнічала падполле ў Мінску. У 1943 г. падпольшчыкі разам з партызанамі ажыццявілі аперацыю па забойстве гаўляйтэра Беларусі В. Кубэ, падклаўшы яму ў ложак міну. Удзельнікі гэтай аперацыі А. Р. Мазанік, М. Б. Осіпава і Н. В. Траян сталі Героямі Савецкага Саюза. Нямецка-фашысцкія акупанты ахрысцілі Мінск «страляючым горадам». У Віцебску адным з кіраўнікоў партыйнага падполля была Вера Захараўна Харужая, якую восенню 1942 г. арыштавалі і пасля катаванняў забілі.

Мірнае насельніцтва акупіраванай тэрыторыі Беларусі вяло барацьбу супраць захопнікаў. Яны папаўнялі армію партызан людзьмі, забяспечвалі іх адзеннем, прадуктамі і медыкаментамі, клапаціліся аб параненых, збіралі, рамантавалі і перадавалі ў атрады зброю і боепрыпасы, будавалі абарончыя ўмацаванні і аэрадромы, выконвалі ролю сувязных, разведчыкаў і праваднікоў.

Бессмяротны подзвіг здзейснілі жыхары палескай вёскі Навіны (цяпер Салігорскі раён), браты Міхаіл і Іван Цубы. Карнікі ўварваліся ў вёску, схапілі іх і загадалі паказаць дарогу ў партызанскі лагер. Міхаіл Цуба адразу адмовіўся і на вачах брата быў застрэлены. 70-гадовы Іван Цуба завёў фашыстаў у дрыгву. Яму ўдалося перадаць партызанам пра сваё рашэнне праз унука. Фашысты па-зверску забілі патрыёта.

Подзвіг братоў Цубаў паўтарыў 12-гадовы хлопчык Ціхан Баран. Прыкладам для піянераў усёй краіны доўгія часы быў Марат Казей — юны разведчык партызанскай брыгады, якая дзейнічала ў Мінскай вобласці. Падлетак падараваў сябе гранатай, калі апынуўся ў акружэнні ворага. Яму пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. У красавіку 1944 г. здзейсніў подзвіг 17-гадовы падрыўнік Мікалай Гойшык. У час чарговай аперацыі партызанам не ўдалося замініраваць рэйкі. Тады Мікалай кінуўся з мінай пад эшалон з танкамі, гарматамі і жывой сілай ворага. Юная Зіна Партнова стала ўдзельнікам Обальскага камсамольска-маладзёжнага падполля ў Віцебскай вобласці. Пасля выканання чарговага задання яна была схоплена фашыстамі. У час допыту дзяўчына застрэліла нямецкага афіцэра. Ёй пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

З першых дзён акупацыі на барацьбу з ворагам заклікала духавенства. Свяшчэннік Успенскай царквы ў Іванаўскім раёне на Піншчыне айцец Васіль Капычко стаў партызанскім сувязным. Трагічны лёс сваіх прыхаджан, заўжыва спаленых фашыстамі ў 1942 г., падзяліў свяшчэннік Свята-Пакроўскай царквы вёскі Хорастава на Міншчыне Іаан Лойка. Свяшчэннік Свята-Петрапаўлаўскай царквы ў Ружанах на Брэстчыне Іаан Наўроцкі дапамагаў у 1941 г. аперыраваць у будынку царквы параненых савецкіх ваеннапалонных.

Усенародны рух супраціўлення захопнікам, удзельнікамі якога былі 374 тыс. партызан і 70 тыс. падпольшчыкаў, пацвердзіў справядлівы характар Вялікай Айчыннай вайны.

**Заключэнне.** Вызначэнне дакладных патрабаванняў да ўзроўню падрыхтоўкі вучняў базавай школы па гісторыі Беларусі і выкарыстанне практыка-арыентаваных заданняў школьнікамі, якія вывучалі прадмет на паглыбленым узроўні, дазваляе рэалізаваць дзейнасны падыход да навучання і патрабуе ўдасканалення формаў выніковай атэстацыі. Дапрофільная падрыхтоўка вучняў IX—X класаў абумоўлівае мэтазгоднасць стварэння сістэмы практыка-арыентаваных заданняў, якая ў комплексе з традыцыйнымі сродкамі навучання будзе садзейнічаць фарміраванню спецыяльных гістарычных уменняў і дазволіць у пэўнай ступені забяспечыць праблемна-тэарэтычны ўзровень вывучэння зместу вучэбнага матэрыялу па гісторыі Беларусі.

### Спіс выкарыстанай літаратуры


1. *Алексашкина, Л. Н.* Деятельностный подход в изучении истории в школе / Л. А. Алексашкина // Преподавание истории и обществознания в школе. — № 9. — С. 10–20.
2. *Аванесов, В. С.* Форма тестовых заданий: учеб. пособие для учителей школ, лицеев, преподавателей вузов и колледжей / В. С. Аванесов. — 2-е изд., перераб. и расшир. — М. : Центр тестирования, 2005. — 156 с.
3. *Вяземский, Е. Е.* Как сегодня преподавать историю в школе: пособие для учителя / Е. Е. Вяземский, О. Ю. Стрелова. — М. : Просвещение, 2000. — 112 с.
4. *Лозицкий, В. Л.* Развитие творческого мышления школьников с помощью информационных педагогических технологий / В. Л. Лозицкий // Гісторыя: праблемы выкладання. — 2008. — № 1. — С. 25–32.
5. *Паноў, С. В.* Гісторыя Беларусі: рознаўзроўневыя заданні для падрыхтоўкі да экзамену (базавая школа) / С. В. Паноў, Н. М. Ганушчанка. — Мінск : Аверсэв, 2006. — 87 с.